**Студыя выяўленчага мастацтва “Каляровы аловак”** створана ў 1981 годзе на базе дзяржаўнай установы адукацыі “Навагрудскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”. Званне “ўзорны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь” студыя выяўленчага мастацтва “Каляровы аловак” атрымала ў сакавіку 2009 г. (рашэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 25 сакавіка 2009 года № 43), пацвердзіла найменне “ўзорны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь” у 2014 годзе (пастанова калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта ад 2 мая 2014 года № 9).

Яе першым заснавальнікам быў Уладзімір Аляксандравіч Грэк. З 2014 па 2015 год студыю ўзначальваў Аляксандр Іванавіч Нелюбовіч. З 2016 года студыяй кіруе Ганна Сяргееўна Манекіна, якая ў 2017 годзе прыняла ўдзел у педагагічным форуме “Культуралагічны падыход у развіцці прафесійнага майстэрства педагогаў дадатковай адукацыі”, дзе прадставіла вопыт работы студыі і была адзначана падзякай УА “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” за актыўны ўдзел у рабоце рэспубліканскага педагагічнага форума (г.Мінск).

Кіраўнік і навучэнцы студыі з’яўляюцца ўдзельнікамі і лаўрэатамі рэгіянальных, абласных, рэспубліканскіх, міжнародных конкурсаў і фестываляў: рэспубліканскі конкурс юных мастакоў “…А музыка гучыць” рэспубліканскага штомесячнага часопіса для дзяцей і падлеткаў “Арэлі” УП “Агенства “Мінск-Навіны” (г.Мінск, лаўрэаты I і III ступеняў), абласны этап рэспубліканскай выставы дзіцячай творчасці “Kazki.by” (г.Гродна, лаўрэат II ступені ў намінацыі “Графіка”, 2017г.).








